УДК 821.161.3’373.611

# УТВАРЭННЕ ІНДЫВІДУАЛЬНА-АЎТАРСКІХ ПРЫМЕТНІКАЎ У ПАЭТЫЧНАЙ МОВЕ АЛЕГА ЛОЙКІ

**А. В. Солахаў**
(Мазыр, Беларусь)

*У артыкуле на багатым фактычным матэрыяле даследуецца ўтварэнне індывідуальна-аўтарскіх неалагізмаў-прыметнікаў Алега Лойкі: разглядаюцца спосабы словаўтварэння і іх прадуктыўнасць, вызначаюцца словаўтваральныя тыпы, адзначаюцца прычыны звароту паэта да словатворчасці.*

*Ключавыя словы: індывідуальна-аўтарскі неалагізм, прыметнік, спосаб словаўтварэння, словаўтваральны тып, прадуктыўнасць.*

*В статье на богатом фактическом материале исследуется образование индивидуально-авторских неологизмов-прилагательных Олега Лойко: рассматриваются способы словообразования и их продуктивность, определяются словообразовательные типы, отмечаются причины обращения поэта к словотворчеству.*

*Ключевые слова: индивидуально-авторский неологизм, прилагательное, способ словообразования, словообразовательный тип, продуктивность.*

*The article studies the production of individually-authored adjectival neologisms by Oleg Loyka: in the focus of our attention are the ways of word-building from the point of view of their productivity, derivational types and reasons for the author’s intention to make up neu words.*

*Key words: individually-author's neologism, an adjective, a way of word -building, derivational type, productivity.*

Алег Лойка — яркі і самабытны прадстаўнік беларускай літаратуры 2-й паловы XX — пачатку XXI стст. Ствараючы той або іншы мастацкі вобраз, ён нярэдка звяртаўся да магчымасцей беларускага словаўтварэння, утвараючы для рэалізацыі сваіх творчых задум новыя словы розных часцін мовы. Індывідуальна-аўтарскія неалагізмы (ІАН), якія да апошняга часу яшчэ не разглядаліся даследчыкамі, з’яўляюцца яркім паказчыкам творчай індывідуальнасці паэта.

Аналіз утварэння ІАН-прыметнікаў у мове паэтычных твораў А. Лойкі паказвае, што самым прадуктыўным спосабам іх утварэння з’яўляецца суфіксальны, які аб’ядноўвае некалькі словаўтваральных тыпаў:

1) **аснова назоўніка + суфікс *-н-ы* або яго ўскладнены варыянт *-ычн-ы*** = прыметнік са значэннем ‘які адносіцца да таго, мае тое або якасць таго, што названа ўтваральнай асновай’: *бедалажны* ‘які мае якасці бедалагі’ (< *бедалага*): *Маці памерла даўно ў іх **бедалажнай** хаце: старэйшы малодшаму брат тут за родную маці* [1, с. 59]; *ветахны* ‘які мае якасці ветаха; які заканчваецца’ (< *ветах*): *Час жыцця маладзіковы, **ветахны** скону час; не падняць падковы, што*



МГПУ им. И.П.Шамякина

*разлучае нас* [3, с. 177]; *лотасны* ‘які мае адносіны да лотасу’ (< *лотас*): *…Дай **лотасны** світанак, дай хоць яго краёчак вуснамі крануць* [1, с. 82]; *цямрычны* ‘які мае якасць цемры’ (< *цемра*): *Ў прасветлым сонцы і ў **цямрычнай** сцюжы* [3, с. 10];

2) **аснова дзеяслова + суфікс *-н-ы* або яго ўскладнены варыянт *-льн-ы*** = прыметнік са значэннем ‘які схільны да дзеяння або здольны выканаць дзеянне, названае ўтваральнай асновай’: *грайны* ‘які здольны іграць; пявучы’ (< *іграць*): *Сэрцу ж майму — здзіўляцца, ва ўдзячнасці — быць ахайным тым, хто нястомны ў працы і ў слове, бы музыка, **грайны*** [1, с. 42]; *хлынны* ‘імклівы, раптоўны’ (< *хлынуць*): ***Хлынны** час, імклівы, стань нашым Запарожжам, і тым нас ашчаслів, што змагчы мы зможам* [3, с. 41]; *ачмуральны* ‘які здольны ачмураць’ (< *ачмураць*): *Шыпшына сакральная, бузіна **ачмуральная** і асабліва настырны пустырнік* [3, с. 35];

3) **аснова назоўніка + суфікс *-іст-ы*** = прыметнік са значэннем ‘які валодае ўласцівасцямі таго, мае або змяшчае (нярэдка ў вялікай меры) тое, што названа ўтваральнай асновай’: *лішаісты* ‘які валодае ўласцівасцямі лішая’ (< *лішай*): *На дабрату, а шчодраю на подласць, на нізасць недаверу і каварства, **лішаістая**, быццам хамельён, слізготлівае, як змяя-мядзянка* [2, с. 130]; *святлісты* ‘які змяшчае святло’ (< *святло*): *Выгінаць іх [агні] **святлістым** сярпом Бамбей дасюль не замлеў, хоць не называе іх маладзіком, а Пацеркамі Каралеў* [1, с. 57]; *струністы* ‘які валодае ўласцівасцямі струны; стройны’ (< *струна*): *Жывіцай дыхну сярод бору, на крок ад сасны адступлю, каб **струністай**, залатакорай бязгучна шапнуць ёй: «Люблю…»* [3, с. 211];

4) **аснова назоўніка + суфікс *-ов-ы* (*-ав-ы*)** = прыметнік са значэннем ‘які адносіцца да таго або ўласцівы таму, што названа ўтваральнай асновай’: *віжовы* ‘які мае адносіны да віжа’ (< *віж*): *Ды цямней яго думкі тайныя, чым **віжовыя** шляхі і расстайныя; ды цямней яго душа змрочная, чым турма яго апаўночная.* [3, с. 120]; *знічкавы* ‘які мае адносіны да знічкі’ (< *знічка*): *Ды я – разам з вамі, я — тут Без **знічкавага** плакання, — О родны, о мілы мой кут Дзекання і цекання!..*[3, с. 37];

5) **аснова прыметніка + суфікс *-ават-ы* (*-яват-ы*)** = прыметнік са значэннем ‘які валодае ў меншай ступені якасцю, названай утваральнай асновай’: *саннаваты* ‘трохі сонны; які толькі ўсходзіць (пра сонца)’ (< *сонны*): *І, дыбаючы, як жураў, дыск сонца **саннаваты** кранаць з вяршынькамі траў, — Якое гэта свята!* [1, с. 10]; *камляваты* ‘з таўставатым камлём’ (< *камель*): *Усміхнуся, хоць мне і не весела, Усміхнуся, каб схаваць журбу Не за лісце, што вярбіна звесіла, Не за **камляватую** вярбу* [1, с. 131];

6) **аснова прыметніка + суфікс *-ав-ы*** = прыметнік са значэннем непаўнаты якасці, названай утваральнай асновай’: *высакавы* ‘высакаваты’ (< *высокі*): *Відны, бо бераг **высакавы**, бо сонца промень тут ласкавы і ў адзінаццаць цёплых столак над імі кожны ясны золак* [2, с. 64];

7) **аснова назоўніка + суфікс *-аст-ы*** = прыметнік са значэннем ‘які характарызуецца знешняй інтэнсіўнай прыметай, названай утваральнай асновай’: *ражкасты* ‘які характарызуецца рожкамі’ (< *рожкі*): *Махнуў аэробус крылом, і зазіхацеў над намі Бамбей **ражкастым** маладзіком* [1, с. 56];

8) **аснова назоўніка + суфікс *-аў*** = прыметнік са значэннем ‘які пакрыты тым, што названа ўтваральнай асновай’: *пылаў* ‘запылены, у пыле’ (< *пыл*): *Не марнай пустальгой-былінкай сысці пад **пылаву** павець, — з табой у полі, хоць хвілінку, упоравень пашалясцець* [1, с. 34–35]. Тып аказіянальны. У літаратурнай мове прыметнікі з такім суфіксам маюць значэнне ‘які належыць таму, хто названы ўтваральным словам’ (БГ, § 628, с. 296) (параўн.: *дзедаў, буслаў, богаў*);

9) **аснова дзеяслова + суфікс *-лів(-ы)*** = прыметнік са значэннем ‘які абазначае схільнасць да дзеяння, названага ўтваральнай асновай’: **бліскотлівы** ‘які бліскаціць, пераліваючыся, іскрыцца’ (< *бліскацець*): *Ды я застаюся ля тых крыніц, ля тых застаюся хваляў, / што з-пад **бліскотлівых** зарніц самі сябе не хваляць* [3, с. 238];

10) **аснова прыметніка + суфікс *-ютк-і*** = прыметнік са значэннем высокай ступені якасці, названай утваральнай асновай, а лексічнае значэнне такіх слоў перадаецца словамі *вельмі, зусім, надта* ў спалучэнні з утваральным прыметнікам: *сухюткі* ‘высахлы, зусім сухі’ (< *сухі*): *Над ім — [кутам безыменным] страха на падпорах – з лісця **сухюткага** пальмаў з гэтых, відаць, што між морам і ўзгор’ем, што засціць даль нам* [1, с. 63];

11) **аснова назоўніка + суфікс *-ск-і* або яго ўскладнены варыянт *-аўск-і*** = прыметнік са значэннем ‘які адносіцца да таго або ўласцівы таму, што названа ўтваральнай асновай’: *эльбрускі* ‘які адносіцца да Эльбруса’ (< *Эльбрус*): *Вы – душа мая і ўсіх тых, Што вышэй двухгалоўя **эльбрускага**, Слаўнарупны між Панятых У прыгоства беларускага* [3, с. 156]; *вожыкаўскі* ‘які адносіцца да часопіса «Вожык»’ (< *«Вожык»*): *Што **вожыкаўская** класіка, Калі ён сатыры леў?! Выкрываў запарожцаўласнікаў, Пакуль персанальнай не меў!..* [1, с. 127];

12) **аснова назоўніка + суфікс *-ын-ы*** = прыметнік са значэннем ‘які адносіцца да таго, мае тое або якасць таго, што названа ўтваральнай асновай’: **лаўжыны** (< *лаўжы*): *… Саладзенькай ажынай і мядзянкай **лаўжынай**, зоркай светлаю, яснай і варонай няшчаснай* [1, с. 132].

Адзначаюцца таксама дэрываты, у якіх суфікс далучыўся да скарочанай асновы па мадэлі: **аснова дзеяслова — суфікс *-а-* або *-ава-* + суфікс**

МДПУ імя І.П. Шамякіна

***-лів(-ы)*** = прыметнік са значэннем 'які абазначае схільнасць да дзеяння, названага ўтваральнай асновай': *джглівы* 'які джгае, раніць, упіваецца джалам' (< *джгаць*): *Не **джглівая** мядзянка, не змяя, хто, акрамя мяне, боль знае мой, як я* [2, с. 49]; *раскошлівы* 'які раскашуе' (< *раскашаваць*): *Зямля, маё жыццё, мая калыска, са мною ў даль **раскошлівую** глянь!..* [1, с. 22].

Утваральнымі асновамі 24-х разгледжаных дэрыватаў сталі асновы назоўнікаў (14 слоў), прыметнікаў (4 словы) і дзеясловаў (6 слоў).

Прычынай утварэння гэтых ІАН-прыметнікаў паслужыла імкненне аўтара, з аднаго боку, ужыць яркі, непаўторны эпітэт, засяродзіць на ім увагу, з другога — даць дакладнае абазначэнне прыметы і запоўніць лакуны ў лексічнай сістэме беларускай мовы.

**Прэфіксальныя** ІАН-прыметнікі вызначаюцца меншай частотнасцю, чым суфіксальныя. Адзінкавыя зафіксаваныя дэрываты ўтвораны наступным чынам:

1) **прэфікс *звыш-* + аснова прыметніка** = прыметнік, які абазначае: а) надзвычай высокую ступень праяўлення прыметы, названай утваральным словам: *звышразумны* 'самы разважлівы, кемлівы, надзелены жыццёвай мудрасцю'; б) перавышэнне якасці, названай утваральным словам: *звышідэальны* 'які пераўзыходзіць ідэал; узвышаны, незямны', *звышкасмічны* 'які знаходзіцца за межамі космасу': *Я буду там **звышразумны**, ды – сумны; я буду там **звышідэальны**, ды – сузіральны* [2, с. 63]; *І думка ясная ў абгон разумных воч **узвышкасмічнае** прадонне залятае...* [1, с. 32];

2) **прэфікс *за-* + аснова прыметніка** = прыметнік са значэннем 'які значна перавышае ступень якасці, названай утваральным словам': *запрапашчы* 'безнадзейны, няўдачны': *Я – «я» **запрапашчае**, зганяе ў «дарма», ды на дарозе, якая вядзе з ярма* [3, с. 82];

3) **прэфікс *не-* (*-ня-*) + аснова прыметніка** = прыметнік са значэннем 'які паказвае на адсутнасць таго або супрацьлегласць таму, што названа ўтваральным словам': **неакцызны** 'які не мае адносін да акцызу': *Саматканка **неакцызная**, **неакцызны** чамергес, практыка, як лес, вялізная і з тэорыяй прагрэс* [3, с. 155]; **незасмяглы** 'несухі, нявысахлы; супрацьлегласць засмягламу': *І мудрай думкі карані, і ласкі **незасмяглай** пяром ці клавішам крані, і з далі недасяглай.* [3, с. 233]; **нябронзавы** 'зроблены не з бронзы': *Быў бы **нябронзавым** Буда, неба магло б не мгліцца, глядзеў бы на вас, як на цуда, званы ў звычайных капліцах!..* [1, с. 69].

**Прэфіксальна-суфіксальным** спосабам утвараюцца ІАН-прыметнікі па наступных словаўтваральных тыпах:

1) **прэфікс *анты-* + аснова назоўніка + суфікс *-н-ы*** = прыметнік, які абазначае накіраванасць супраць таго, што называе ўтваральная аснова: *антыдачны* 'які накіраваны супраць дач': *Ах, які сацыяльна значны, дэмагогам – падвох: эпас пісаў **антыдачны**, пакуль дачы ўзяць не мог!..* [1, с. 127];

2) **прэфікс *за-* + назоўнік + суфікс *-ав(ы)*** = прыметнік са значэннем 'які знаходзіцца па той бок, за тым, што названа ўтваральнай асновай': *заплотавы* 'які знаходзіцца за плотам': *Не ўе жаўрук гнязда між палыну і не пяе над ім – **заплотавым**, затынным, вітаючы зялёную вясну ці колас зернем наліваючы буштынным* [2, с. 7];

3) **прэфікс *за-* + назоўнік + суфікс *-н(ы)*** = прыметнік са значэннем 'які знаходзіцца па той бок, за тым, што названа ўтваральнай асновай': *затынны* 'які знаходзіцца за тынам': *Не ўе жаўрук гнязда між палыну і не пяе над ім – заплотавым, **затынным**...* [2, с. 7];

4) **прэфікс *над-* + аснова назоўніка + суфікс *-н(ы)*** = прыметнік са значэннем 'які знаходзіцца над тым, вышэй за тое, што названа ўтваральнай асновай': *надкрынічны* 'які знаходзіцца над крыніцай': *Ці ж родная ты мне, птушынцы, зверу: ты ж нас не нараджала, не ўзняла, як лёзы **надкрынічнага** аеру, над ярам — явар, ліпу — ля сяла?* [1, с. 41];

5) **прэфікс *пад-* + аснова назоўніка + суфікс *-ав(ы)*** = прыметнік са значэннем 'які падпарадкаваны таму, не абыходзіцца без таго, што названа ўтваральнай асновай': *падсалоўкавы* 'які не абыходзіцца без салоўкі': *Паціхеньку ў вакно дзень дзенькае **падсалоўкаваю** вясной* [3, с. 9]. Тып аказіянальны;

6) **прэфікс *ня-* + аснова дзеяслова + суфікс *-н(-ы)*** = прыметнік са значэннем прыметы паводле дзеяння, якое нельга ажыццявіць: *няўбачны* 'які нельга ўбачыць': *І ўсіх купцоў усіх часоў скалпеней схіляемся мы да **няўбачных** скарбаў – да дзён, пражытых як мага пякней у карагодзе рассяпаных фарбаў.* [1, с. 32]. Тып аказіянальны.

Адзначаныя ІАН-прыметнікі ўтвораны як з намінатыўнай мэтай (*знічкавы, віжовы, святлісты, эльбрускі*), так і з мастацкай — стварыць арыгінальны вобразны эпітэт (*падсалоўкаваю вясной, надкрынічны аер*).

Са складаных спосабаў найбольш прадуктыўным з'яўляецца спосаб, які традыцыйна называюць складананульсуфіксальным. Утварэнне ім ІАН-прыметнікаў ажыццяўляецца па наступнай мадэлі: **аснова прыметніка + інтэрфікс + аснова назоўніка** = прыметнік са значэннем 'які валодае тым, што названа апорнай асновай і канкрэтызавана ў першай аснове складання': *беластрэхі* 'з белай страхой': *Балтыкі светлы доме, **беластрэхі** ад хваль, сосны тваёй Суомі – Белавежскія аналь* [2, с. 100]; *залатакоры* 'з карой залацістага колеру': *Жывіцай дыхну сярод бору, на крок ад сасны адступлю, каб струністай, **залатакорай** бязгучна шапнуць ёй: «Люблю…»* [3, с. 211]; *светлакосы*

МГПУ им. И.П. Шамякина

'са светлымі косамі': *Паблісквайце, як вочы нашы, лінзы, не дрыжыце, рукі мудрыя хірургаў: памыйніцу трымае **светлакосая** ў белым халаце санітарка* [2, с. 132]; *светлачолы* 'светлагаловы, са светлымі валасамі, бялявы': *Між бугенвілію жыла, як на промені, на алеі, **светлачолая**, як лілея, – у агністым жыла бугенвілі... Забілі!* [1, с. 77]; *хваравекі* 'з хворымі векамі': *Адзін, рыжы, адну шостую частку кулі зямное крывёю людскою ўсё насычае, насычае, другі, **хваравекі**, адну шостую частку кулі зямное, ашчаперыўшы аберуч, туляючы да расхістанае грудзіны з крыві ўсё выціскае і выціскае…* [3, с. 97]; *цвёрдачолы* 'цвердалобы, упарты': *І таго баюся, што спанцырнеюць грудзі: **цвёрдачолым** не абярнуся з вамі, змякчэлыя людзі* [3, с. 134].

Прычынай іх узнікнення з'явілася жаданне паэта стварыць свежы, семантычна ёмісты, эмацыянальна- і вобразна-яркі эпітэт.

Фіксуюцца таксама ІАН-прыметнікі, спосабам утварэння якіх з'яўляецца асноваскладанне, або, дакладней, асновасловаскладанне, калі аснова аднаго прыметніка пры дапамозе інтэрфікса злучаецца з самастойным прыметнікам. Гэтым спосабам утвараюцца ІАН-прыметнікі:

а) са спалучальнымі адносінамі кампанентаў, якія выражаюць адзіную прымету, што з'яўляецца сумай прымет, названых ва ўтваральных асновах (словах): *бледна-жоўты* 'афарбаваны ў няяркі жоўты колер' (<*бледны і жоўты*): *Маладзіковы ж камень спакваля высвечваўся, як з космасу зямля, ахутаная шлейфамі цыклонаў, і **бледна-жоўтых** шчэ і ўжо зялёных. ну, а тапаз вясёлкі вокал пас* [1, с. 72]; *бравурна-эстрадны* 'шумны, бадзёры, прыўзняты, эстрадны' (<*бравурны і эстрадны*), *інтэр'ерна-нямы* 'які не выклікае пачуццяў' (<*інтэр'ерны і нямы*): *Каму ж быць з музыкай радам, як словам песні самой не **бравурна-эстраднай**, не **інтэр'ерна-нямой**...* [1, с. 113]; *плыннахуткі* 'хуткацечны' (<*плынны і хуткі*): *І абдымае ён падданага, як Бог, і пергаментныя аж два ўручае скруткі, шкадуючы, што час так **плыннахуткі**, / І адпускае яго ў тысячу дарог.* [3, с. 122];

б) з падпарадкавальнымі адносінамі кампанентаў, калі адна з асноў выступае ў адносінах да другой як удакладняльная: *слюнядзявочы* 'плаксівы, дзявоцкі' (<*дзявочая слюня*): *Ах, стойлаў ты сяло **слюнядзявочых**, Ільіч табе не геній-херувім, калёсікам і вінцікам не хочаш, абернешся пасмешышчам усім!* [3, с. 216].

Сустракаюцца таксама ІАН-прыметнікі, утвораныя **зрашчэннем + суфіксацыяй**, г. зн. безмарфемным аб'яднаннем двух або некалькіх слоў у адну лексічную адзінку і далучэннем да ўтваральнай асновы суфікса па мадэлі: **назоўнік + аснова назоўніка + суфікс *-ов-ы (-ев-ы)*** = прыметнік са значэннем 'які абазначае пэўны час або працягласць у часе, названыя дзвюма ўтваральнымі асновамі': *канецстагоддзевы* 'пры канцы стагоддзя': *Рвуць і плакаць не даюць, рэжучы край на раны **канецстагоддзевыя**, не Богавыя, рукамі нашымі высучаныя смярчы-ўраганы* [3, с. 81]; *спаконвяковы* 'які існуе спакон вякоў, спрадвечны; пастаянны': *І цень мой з гонкім тваім ценем там, дзе бясконцасці мяжа, дрыготкім сонечным спляценнем пад сэрцам песні задрыжаў — той, залатой, як ты, мой колас **спаконвяковых** баразён, якога ціхі мудры голас, нібы грамы, зямлі чуцён* [1, с. 35].

У адным выпадку можна гаварыць пра **імпазіцыю + выдаленне гука + суфіксацыю** — спосаб, якім утвараецца ІАН-прыметнік па мадэлі: **аснова назоўніка + выдаленне гука + суфікс -*яст(-ы)*** = прыметнік са значэннем падабенства: *кляшнясты* 'які нагадвае клешчы і служыць для хапання' ← *кл/ю/шн(я) + клеш/ч/(ы) + -яст(ы)*: *Мае **кляшнястыя** абдымкі – не мінуць, як не мінае вас дзень, ноч, любоў, нянавісць* [2, с. 131].

Такім чынам, матэрыял даследавання сведчыць аб даволі вялікай прадуктыўнасці суфіксальнага спосабу. Іншыя спосабы дэрывацыі выкарыстоўваюцца радзей. Пры ўтварэнні ІАН-прыметнікаў ужываюцца пераважна вядомыя мове словаўтваральныя тыпы, хоць іншы раз аўтарам яны парушаюцца.

Асноўнай прычынай утварэння большасці індывідуальна-аўтарскіх прыметнікаў з'яўляецца імкненне паэта стварыць вобразны, яркі, арыгінальны эпітэт, дабіцца сцісласці выказвання і зрабіць яго семантычна насычаным.

Выкарыстоўваючы розныя спосабы словаўтварэння, спалучаючы ў адным слове асновы розных часцін мовы і рознай семантыкі, А. Лойка тым самым сведчыць пра невычэрпныя магчымасці беларускага словаўтварэння.

МГПУ им. И.П. Шамякина

**Літаратура**

1. Лойка, А. Грайна: паэзія / Алег Лойка. Мінск: Маст. літ.,1986. 142 с.
2. Лойка,А.Трэці золак: вершы і паэма / Алег Лойка. Мінск: Маст. літ., 1993. 254 с.
3. Лойка, А. Ушанаванне: кніга паэзіі / Алег Лойка. Слонім : Слонімская друкарня, 2001. 319 с.